# ТЭМАТЫЧНЫЯ ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

## ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ

**1. Размяркуйце словы (спалучэнні слоў) па слупках: у левы слупок – словы, у якіх правапіс падкрэсленых літар заснаваны на фанетычным прынцыпе, у правы – на марфалагічным прынцыпе.**

Выдавецкі, мноства,бярозка, адэскі, імпрэсарыа, брута, грамадства, волжскі, на кладцы, асветлены, боязь, не быў, над хатай, дзядзька, падступіць, біёлаг, сурочыць, людзі, сэрца.

| Фанетычны прынцып напісання | Марфалагічны прынцып напісання |
|---|---|
| | |

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2. Дапоўніце пункты правіла прыкладамі (колькі пропускаў, столькі прыкладаў).**

Літара э пішацца:

1. У пачатку выклічнікаў ____, ____, _____, ____, ____.
2. Пасля шыпячых, [р], [д], [т] і цвёрдага [ц]: ____, ____, ____, ____, ____, ____, ____, ____.
3. На канцы запазычаных нязменных слоў, а таксама ўласных імён і геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя *л, к*: ____, ____, ____; ____, ____, ____; але: ____, ____, _____, _____.

**3. У кожнай групе падкрэсліце слова, правапіс якога не адпавядае сучасным арфаграфічным нормам**.

1. Аўтсайдар, містэр, драмадэр, кардар, кратар.
2. Стогадовы, стадзённы, стаградусны, стаклетачны, статысячны.
3. Клаўстрафобія, траурны, раўнд, ноў-хаў, клаўнада.
4. Чэрвеньскі, казанскі, Булонскі (лес), цянь-шаньскі, смаргонскі.

**4. Прывядзіце прыклады абрэвіятур, напісанне якіх не адлюстроўвае натуральнае вымаўленне. Расшыфруйце.**

**5. Запішыце прапанаваныя словы, згодна з агульнапрынятымі правіламі скарачэння.**

Акадэмік, былы, бухгалтэрыя, вёска, выконваючы абавязкі, востраў, возера, год, гады, горад, гэта значыць, глядзі, грамадзянін, дацэнт, загадчык, зборнік, напрыклад, старонка, старонкі, Дзмітрый Дзмітрыевіч.

**6. Запішыце па-беларуску.**

Совхоз, хоздоговор, собкор, Совмин, Совнархоз, информбюро, собес, ОМОН, ЗАГС, зауч, линкор, главврач, промкомбинат, комбат, комэска, облисполком, интерпол, Белгоспроект, госюрколлегия.

**7. Запішыце па-беларуску.**

Корреспондент, баррикада, моллюск, пицца, манна, месса, сессия, группа, коррида, донна, меццо-сопрано, террикон, колонна, барокко, аббат, Ницца, саванна, баллон, коммюнике, абсцисса.

**8. З прапанаванай групы выберыце і запішыце толькі тыя словы, у якіх пры перакладзе на беларускую мову ўзнікае прыстаўны в. Патлумачце.**

Опыт, отсвет, убор, Осло, ойканье, убавить, отголосок, орган, отзвук, весь (день), опус, опись, угро-финны, отрок, окать, урочище, узор, удочка, гусеница (зоол.), внук.

**9. Успомніце правілы на правапіс д-дз, т-ц. Размяркуйце словы ў адпаведнасці з пунктамі правіла. Патлумачце.**

Дынастыя, цёмна, тэарэма, стымул, брыгадзір, гвардзеец, Дзвіна, цвік, дыспетчар, цень, дзесьці, дэдукцыя, дзюшэс, цюлень, фунцік, каранцін, адвячорак, (у) бітве.

**10. Падкрэсліце словы, правапіс якіх абумоўлены націскам.**

Папялішча, магнетызм, крэпдэшын, парадыйны, Леанарда да Вінчы, Бетховен, сінхранізм, Філіп Жэрар, экзэмпляр, тэкстолаг, дзясяты, восемсот, экспедытар. Фальклярыстыка, ерэтык, сяміграддзе, лесаруб, Энгельгарт, многавяковы, крэп-жаржэт.

**11. Запішыце па-беларуску: спачатку словы з падоўжанымі зычнымі, а потым – без іх.**

Алея, ассимиляция, аттестат, законность, ванна, затишье, аппарат, грамматика, подножье, приволье, гулянье, группа, пресса, пятью, радостью, сталью, эффект, судья, шестью.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**12. З прапанаванымі адзінкамі складзіце сказы так, каб слова (не ў пачатку выказвання) пісалася ў адным сказе з загалоўнай літары, а ў другім – з прапісной.**

Колас – колас, Мір – мір, Мінскі – мінскі, Танк – танк, Раман – раман, Купалаўскі – купалаўскі, Верас – верас.

**13. Запішыце словы па-беларуску.**

Протеже, фельдшер, карате, торшер, скутер, сканер, свитер, пинчер, постер, адрес, катет, Юпитер, Кармен, велюр, бармен, берет, веер, миледи, метро, супермен.

**14. Запішыце словы ў адпаведнасці з правіламі беларускай арфаграфіі.**

Гляс(э, е), каф (э, е), пэнсн(э, е), кашн(э, е), імпрэсары(о, а), партфолі(о, а), адапт(а, э)р, блокбаст(а, э)р, гангст(а, э)р, камп'ют(а, э)р, гастарбайт(а, э)р, лід(а, э)р, менедж(а, э)р, парэ(о, а), ст(а, о)гадовы, дз(е, я)сятка, пяцьдз(е, я)сят, Нью-(Ё, Йо)рк, пі(а, я)рход, пл(е, я)яда

**15. Якія вы ведаеце нялітарныя графічныя сродкі беларускай мовы? Запішыце.**

**16. Запішыце састаўныя назвы літар.**

**17. Запішыце ўрывак з паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча “Гапон” (які падаецца паводле выдання 1907 г.) сучаснай графікай. Назавіце выкарыстаныя графічныя сістэмы.**

Haspadary za stalom
Hromka hutarku wiaduc′;
A landarka z landarom,
Miod harelku razdajuc′

Chlopcu, dzieŭki, maladzicu
La paroha hamaniac′,
A staruie čaraŭnicy
Ciškom la piečˎy siadzac′.

**18. Назавіце беларускіх аўтараў, творы якія былі надрукаваны лацінкай.**

**19. Як называліся старажытныя кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом? Кім яны ствараліся? Што складае іх змест?**

**20. Колькі літар мела старажытная кірыліца? Якія літары старажытнага кірылаўскага алфавіта мелі лічбавае значэнне – 1, 2, 5, 200, 900.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ДАВЕДКІ

**1**.

| Фанетычны прынцып напісання | Марфалагічны прынцып напісання |
|---|---|
| Выдавецкі, мноства, адэскі, імпрэсарыа, брута, біёлаг, сурочыць, людзі, сэрца. | Бярозка, грамадства, волжскі, на кладцы, асветлены, боязь, не быў, над хатай, падступіць, дзядзька. |

**2**. Літара **э** пішацца:

1. У пачатку выклічнікаў *э, эге, эге-ге, эй, эх*.

2. Пасля шыпячых, [р], [д], [т] і цвёрдага [ц]: *жэмчуг, шэры, чэкавы, нараджэнне, рэкі, халадэча, мястэчка, у руцэ*.

3. На канцы запазычаных нязменныхслоў, а таксама ўласных імён і геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя *л, к*: *рэзюмэ, кафэ, плісэ*; *Мерымэ, Морзэ, Леселідзэ*; але: *сальта-мартале, філе, камюніке, піке*.

**3.** 1. Аўтсайдар, <u>містэр</u>, драмадэр, кардар, кратар.

2. <u>Стогадовы</u>, стадзённы, стаградусны, сталетачны, статысячны.

3. Клаўстрафобія, траурны, раўнд, <u>ноў-хаў</u>, клаўнада.

4. Чэрвеньскі, казанскі, Булонскі (лес), <u>цянь-шаньскі</u>, смаргонскі.

**4.** РІВШ [рыўш] – Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы.

ТЮГ [ц’ух] – Тэатр юнага гледача.

**5.** Акадэмік – акад., былы – б., бухгалтэрыя – бухг., вёска – в., выконваючы абавязкі – в. а., востраў – в-аў, возера – воз., год – г., гады – гг., горад – г., гэта значыць – г. зн., глядзі – гл., грамадзянін – гр., дацэнт – дац., загадчык – заг. , зборнік – зб., напрыклад – напр., старонка – с., старонкі – сс., Дзмітрый Дзмітрыевіч – Д.Д.

**6**. Саўгас, гасдагавор, уласны карэспандэнт, Саўмін, Саўнаргас, інфармбюро, сабес (аддзел **са**цыяльнага за**бес**пячэння), АМАП, ЗАГС, завуч, лінкар (лінейны карабель), галоўурач, прамкамбінат, камбат, камэска (камандзір эскадрылы), аблвыканкам, інтэрпал, Белдзяржпраект, дзяржюркалегія.

**7**. Карэспандэнт, барыкада, малюск, піца, манна, меса, сесія, група, карыда, донна, мецца-сапрана, тэрыкон, калона, барока, абат, Ніца, саванна, балон, камюніке, абсцыса.

**8**. Вопыт, водсвет, войканне, водгалас, водгук, вопіс, вудачка, вусень.

Прыстаўны *в* пішацца:

– перад каранёвым *у* ў пачатку ці ў сярэдзіне слова пасля прыстаўкі або першай часткі складанага слова;

– у словах *павук, цівун*, *Навум, Матэвуш*, *Тадэвуш* і вытворных ад іх;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– перад націскным *о* ў пачатку або ў сярэдзіне слова пасля прыстаўкі ці першай часткі складанага слова.

Прыстаўны *в* не пішацца:

– калі націск з *о* сыходзіць і яно пераходзіць у *а*;

– перад *у* прыставачным і *у*, якое развілося з *в*;

– перад пачатковымі *о* і *у* ў словах іншамоўнага паходжання, і ўласных назвах.

**9**. 1. Пры змякчэнні [д], [т] пераходзяць у [дз’], [ц’] і абазначаюцца літарамі *дз, ц*, якія пішуцца перад галоснымі *е, ё, ю, я, і*, а таксама *ь* і мяккім [в’]: *цёмна, цень, дзесьці, цвік, Дзвіна*.

2. Прыставачнае [д] і суфіксальнае [т] не змякчаюцца: *адвячорак,* (*у*) *бітве*.

3. У запазычаных словах [д], [т], як правіла, цвёрдыя: *дынастыя, тэарэма, стымул, дыспетчар, дэдукцыя*.

4. У некаторых запазычаных словах [д], [т] змякчаюцца: *цюлень, фунцік, карацін, дзюшэс*.

5. Зычныя [д], [т] змякчаюцца і перадаюцца літарамі дз, ц перад суфіксамі -ін, -ір, -ёр, -еец, -ейск, -ік: *брыгадзір, гвардзеец*.

**10.** <u>Папялішча</u>, магнетызм, крэпдэшын, <u>парадыйны</u>, <u>Леанарда да Вінчы</u>, Бетховен, <u>сінхранізм</u>, Філіп Жэрар, экзэмпляр, <u>тэкстолаг</u>, <u>дзясяты</u>, восемсот, <u>экспедытар</u>, <u>фальклярыстыка</u>, ерэтык, <u>сямігоддзе</u>, <u>лесаруб</u>, Энгельгарт, <u>многавяковы</u>, <u>крэп-жаржэт</u>.

**11.**

Ванна, зацішша, падножжа, прыволле, гулянне, пяццю, сталлю, суддзя, узвышша.

Алея, асімілятыя, атэстат, апарат, граматыка, група, прэса, радасцю, эфект, шасцю.

**12.**

Адным з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы з’яўляецца Якуб Колас.

Наліты сокам колас схіліўся долу.

**13.**

Пратэжэ, фельчар, каратэ, таршэр, скутар, сканар, світар, пінчар, постар, адрас, катэт, Юпітэр, Кармэн, велюр, бармен, берэт, веер, міледзі, метро, супермен.

**14.**

Глясэ, кафэ, пенснэ, кашнэ, імпрэсарыа, партфоліа, адаптар, блокбастар, гангстар, камп’ютар, гастарбайтар, лідар, менеджар, парэа, стагадовы, дзясятка, пяцьдзясят, Нью-Ёрк, піярход, пляяда.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**15.**

Апостраф, злучок, знак націску, пунктуацыйныя знакі, прагалы паміж часткамі тэксту, выдзяленне пры дапамозе шрыфтаў і інш.

**16.**

Састаўныя назвы літар: і нескладовае, у нескладовае, мяккі знак.

**17.**

Гаспадары за сталом
Громка гутарку вядуць;
А лендарка з лендаром
Мёд, гарэлку раздаюць.

Хлопцы, дзеўкі, маладзіцы
Ля парога гаманяць,
А старыя чараўніцы
Цішком ля печы сядзяць.

Лацінка (лацінскае пісьмо), кірыліца (кірылаўскае пісьмо).

**18.** Я. Чачот, П. Багрым, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, творы Цёткі (кн. “Скрыпка беларуская”, “Хрэст на свабоду”, “першае чытанне для дзетак беларусаў”), зборнік Янкі Купалы “Гусляр”, газета “Мужыцкая праўда” К. Каліноўскага і інш.

**19.** Кітабы, кнігі, напісаныя на беларускай мове, арабскім пісьмом. Ствараліся з 16 ст. татарамі, што пасяліліся на Беларусі ў 14-16 ст. і паступова забылі родную мову. Змест кітаб складаюць легенды, апісанні мусульманскіх абрадаў, рытуалаў, гаданне на літарах карана, а таксама маральна-этычныя павучанні моладзі, усх. казкі, разгадванне сноў, прыгодніцкія аповесці і інш. (ЭЛіМБел).

**20**. Старажытная кірыліца мела 43 літары, 24 з іх былі візантыйскага паходжання.

1 – А (аз), 2 – В (ведзі), 5 – Є (есць), 200 – С (слова), 900 – Ц (цы).

Святлана МАРОЗ,
Марына РЖАВУЦКАЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ